**9-га МАЯ — ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ. СА СВЯТАМ!**

*Са свежай майскай зелянінай і шматфарбнай квеценню цюльпанаў прыходзіць да ўсіх нас радаснае веснавое свята — Дзень Перамогі. Яно ў календары памятных дат — самае знамянальнае. І асабліва для сённяшніх ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія 53 гады назад абаранілі свет ад фашысцкай карычневай чумы і адстаялі на зямлі мір і свабоду.*

*Усё менш і менш былых франтавікоў сустракаюць штогод Дзень Перамогі: старыя раны, гады бяруць сваё. А наш галоўны абавязак — памятаць пра іх подзвіг, паважаць ветэранаў і клапаціцца аб іх, акружаць увагай і цеплынёй. Яны па праву гэтага заслугоўваюць.*

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 9 (947) | ЧАЦВЕР, 7 мая 1998 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

23 красавіка адбылося чарговае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне Савета універсітэта. На ім зацверджана рашэнне конкурснай камісіі па правядзенню Скарынаўскіх чытанняў. Яны адбудуцца на майскім пасяджэнні Савета. З навуковымі дакладамі выступяць дацэнты А.Ф.Васільеў з кафедры алгебры і геаметрыі, Г.М.Каропа з кафедры геаграфіі, У.І.Коваль з кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства, А.Р.Міроцін з кафедры вышэйшай матэматыкі, ст. выкладчыца В.В.Кавальчук з кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці.

Па інфармацыі прарэктара па навуковай рабоце Д.Р.Ліна разгледжана пытанне аб прадстаўленні праектаў НДР на конкурс Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Выступленне загадчыцы практыкі Ю.Д.Алейнік было прысвечана правядзенню вясноваа-летніх вучэбных і вытворчых практык.

На Савеце разгледжаны таксама шэраг іншых пытанняў універсітэцкага жыцця.

## ПА ПРАГРАМЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

На працягу 10 дзён у нашым універсітэце на чале з віцэ-прэзідэнтам Оверньскага універсітэта па міжнародных сувязях, садырэктарам Франка-Беларускага інстытута кіравання (ФБІК) прафесарам Морысам Шэневуа знаходзілася 7 выкладчыкаў і супрацоўнікаў з горада-пабраціма Клермон-Ферана. Яны прачыталі для студэнтаў ФБІК курс лекцый і правялі практычныя заняткі па вывучаемых дысцыплінах. У рэктараце ГДУ былі абмеркаваны вынікі двухбаковага супрацоўніцтва па праграме ТЭМПУС. Яны прызнаны паспяховымі.

У перадмайскія дні Гомель наведалі і 22 французскія студэнты міжнароднай вышэйшай навучальнай установы. Яны пацікавіліся, як праходзяць заняткі ў ФБІК, азнаёміліся з горадам над Сожам, з задавальненнем зрабілі экскурсію ў сталіцу нашай краіны — горад-герой Мінск.

## ЗАЦВЕРДЖАНЫ КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР

24 красавіка адбылася прафсаюзная канферэнцыя універсітэта. Яе мэтай было зацвярджэнне калектыўнага дагавору на наступныя два гады.

У адпаведнасці з парадкам дня выступілі першы прарэктар прафесар М.В.Селькін і старшыня прафкома Г.І.Варатніцкі. Яны паведамілі аб выніках выканання папярэдняга калектыўнага дагавору. Затым былі заслуханы і па артыкулах зацверджаны новы асноўны дакумент універсітэта і дадатак да яго ад студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі.

## СТАНОВІЦЦА ЦЭНТРАМ ЭКАЛАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Словы, вынесеныя ў загаловак, датычацца нашага універсітэта. Менавіта такое месца адводзіцца яму ў нашай краіне. Пацвярджэннем таму стаў І Беларуска-Брытанскі семінар “Праблемы экалагічнай адукацыі і экалагічнай этыкі”, які адбыўся на базе ГДУ. Яго заснавальнікамі сталі Брытанскае экалагічнае таварыства, універсітэт горада Варвіка — з аднаго боку, ГДУ і Беларуская рэспубліканская асацыяцыя “Зялёны клас” — з другога.

У рабоце семінара прынялі ўдзел грамадзяне Вялікабрытаніі Дэвід Слінгсбі і С’юзен Баркер.

На семінары абмяркоўваліся праблемы зместу, прынцыпаў і мэт экалагічнай адукацыі. Госці пазнаёміліся з асноўнымі падыходамі, прынятымі пры распрацоўцы навучальных праграм у Вялікабрытаніі. Беларускія ўдзельнікі семінара расказалі аб сваіх праграмах, падзяліліся ўласнымі ідэямі ў гэтай важнейшай галіне ведаў. У ходзе семінара абмяркоўвалася магчымасць супрацоўніцтва бакоў у плане сумеснай распрацоўкі праграм, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, а таксама рэалізацыі двухбаковай работы над эколага-адукацыйным праектам, прысвечаным фарміраванню ў навучэнцаў сярэдніх школ і прафтэхвучылішчаў адказных адносін да прыроды.

На семінары выступілі з дакладамі: Д.Слінгсбі — “Біяразнастайнасць: выбар і навучанне”, С.Баркер — “Экалогія ў школьных праграмах па біялогіі і геаграфіі”, а таксама вядучыя вучоныя ГДУ і эколагі горада.

Падрыхтаваў і вёў семінар загадчык кафедры геаграфіі ГДУ, дацэнт, прэзідэнт Беларускай рэспубліканскай арганізацыі “Зялёны клас” Г.Каропа.

Прадугледжана зрабіць экалагічныя семінары такога міжнароднага ўзроўню пастаяннымі.

*Рэспубліканская навуковая канферэнцыя*

## ПА ПЫТАННЯХ ЛІТАРАТУРЫ, МОВЫ І МАСТАЦТВА

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Мазырскі дзяржаўны педагагічны інстытут на базе гэтай ВНУ правялі навуковую канферэнцыю “Канцэптуальныя пытанні развіцця літаратуры, мовы і мастацтва ў святле адраджэння культуры і духоўнасці беларускага народа“.

На пленарным пасяджэнні з дакладамі “Рэгіянальная матываваная лексіка беларускай мовы“, “Асаблівасці развіцця беларускай літаратуры ў пачатку XX стагоддзя“ і “Гомельская школа ў беларускай літаратуры“ ад нашага універсітэта выступілі адпаведна доктар філалагічных навук, прафесар У.В.Анічэнка, прарэктар па вучэбнай і выхаваўчай рабоце, кандыдат філалагічных навук М.М.Воінаў і загадчык кафедры беларускай літаратуры, доктар філалагічных навук, прафесар І.Ф.Штэйнер.

На секцыйных пасяджэннях па беларускай літаратуры, беларускай мове і методыцы яе выкладання, мастацтву было заслухана і абмеркавана таксама 13 навуковых паведамленняў вучоных, выкладчыкаў і аспірантаў нашага універсітэта.

## ВІНШУЕМ!

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты фізічнага факультэта горача віншуюць дацэнта кафедры оптыкі МІЦЮРЫЧА Георгія Сямёнавіча з прысуджэннем яму Прэзідыумам БелВАКа вучонай ступені доктара фізіка-матэматычных навук.***

* * *

***Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры псіхалогіі і падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ горача віншуюць асістэнта названай кафедры КАВАЛЁВА Ігара Пятровіча з зацвярджэннем яго БелВАКам у вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.***

## ПРАІГНАРАВАЛІ

З 21 па 26 красавіка ў нашым універсітэце праходзіў вясновы этап Міжнароднага фестывалю “Арт-сесія”, які насіў назву “Век 21”. Праводзіўся ён у форме міжнароднага мастацкага салона, у якім прымалі ўдзел маладыя мастакі, дызайнеры, мадэльеры, літаратары.

На жаль, падрабязна расказаць на старонках нашай газеты аб праведзеных мерапрыемствах мы не можам, так як супрацоўнікі рэдакцыі не атрымалі запрашальных білетаў ад культурнага цэнтра на самыя цікавыя, відовішчныя конкурсы мастацкага салона.

## ПА СТУПЕНЬКАХ ДА ЗАПАВЕТНАЙ МАРЫ

*Імі ганарыцца універсітэт*



Сярод сваіх аднакурсніц Ганна Верамейчык нічым не вызначаецца, калі не гаварыць аб яе ведах. Даволі сціплая і здаецца нават непрыкметнай. Але калі пазнаёміцца з гэтай студэнткай бліжэй, дык даведаешся з яе кароткай біяграфіі шмат цікавага і павучальнага.

З самага дзяцінства дзяўчынка выхавала ў сабе працавітасць, настойлівасць і мэтанакіраванасць. І калі пайшла ў школу, а вучылася яна ў СШ N10 з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы, бацькі не мелі з ёй ніякіх клопатаў. Дачка рыхтавалася да ўрокаў паўсядзённа і грунтоўна. Калі дазваляў час, высвятляла цікавячыя пытанні звыш школьнай праграмы. Аб выніках стараннасці можна здагадацца: у дзённіку з’яўляліся толькі выдатныя адзнакі. А па заканчэнні школы разам з атэстатам сталасці атрымала залаты медаль.

У школьныя гады адбылася падзея, якая ў жыцці Ганны стала асабліва адметнай. У СШ N10 па традыцыі прыязджалі прадстаўнікі пасольства ЗША ў Рэспубліцы Беларусь для адбору кандыдатур для працягу вучобы ў далёкай заакіянскай краіне. Так як Г.Верамейчык лічылася адной з лепшых знаўцаў англійскай мовы, яе ў ліку нямногіх дапусцілі да конкурсу. Экзамен быў вельмі складаным і адказным. Тэсціраванне праводзілася ў пісьмовай форме. Давялося прайсці праверку і на псіхалагічную сумяшчальнасць. І Ганна была бязмежна шчаслівай, калі праз пэўны час прыйшло запрашэнне на вучобу ў ЗША. Той навучальны год па сутнасці і вызначыў яе выбар будучай прафесіі. Школьніца дасканала авалодала англійскай мовай і цвёрда вырашыла стаць выкладчыцай гэтай дысцыпліны.

Дамоў Ганна вярнулася з Інтэрнацыянальным сертыфікатам аб паспяховым заканчэнні акадэмічнай праграмы ЗША і сертыфікатам аб прызнанні актыўнай удзельніцай арганізацыі Close UP у Вашынгтоне, які падпісалі спікер Томас С.Фолі, прэзідэнт названай арганізацыі Стэфан А.Янгер, прадстаўнікі Сената ЗША Д.Мітчэл і Р.Доул.

За выдатныя поспехі ў навучанні цяперашняя наша студэнтка трэцяга курса спецыяльнасці “Англійская мова” Ганна Верамейчык узнагароджана Ганаровай граматай школы Джадсон (штат Тэхас), дзе яна вучылася. Тут яна выступіла з дакладам аб Беларусі і Расіі. Уважліва слухалі гамяльчанку на канферэнцыі ў Сенаце ў амерыканскай сталіцы.

Ганна Верамейчык па праву лічыцца адной з лепшых студэнтак філалагічнага факультэта. За пяць семестраў вучобы ў яе залікоўцы толькі выдатныя адзнакі. Цяпер паралельна з англійскай будучая выкладчыца паспяхова авалодвае і нямецкай мовай.

Закончыць універсітэт і атрымаць дыплом з адзнакай — запаветная мара выдатніцы. І можна не сумнявацца, што яна абавязкова збудзецца.

**Б.ВАЛОДЗІН.**

**На здымку: выдатніца вучобы Ганна Верамейчык.**
**Фота У.Чысціка.**

Студэнцкая навука

# ЁСЦЬ ЧЫМ ГАНАРЫЦЦА



(Заканчэнне. Пачатак у №8)

К конференции подготовились 13 студентов по различным направлениям совершенствования экономики. Активность студентов-слушателей была очень высокой. Достаточно сказать о первокурснике Андрее Мазуре, который задавал по несколько вопросов каждому докладчику, спорил с "президиумом", что остерегаются делать студенты старших курсов.

Особенность работы секции "Регулирование коммерческой деятельности и совершенствования финансового механизма в современных условиях" заключалась в привлечении к НИРС студентов. нескольких специальностей и курсов экономического факультета. За многие годы в работе впервые приняли участие студенты первого курса специальностей "Финансы и кредит" и "Коммерческая деятельность". Обычно в конференции принимали участие студенты 4-5 курсов по материалам практик.

Когда была развита на факультете хоздоговорная работа с предприятиями, были отдельные случаи участия студентов 1-2 курсов по результатам исследований кафедр, но их труд оплачивался как участников научного коллектива.

Темы выступлений всех участников секции увязаны с современными проблемами экономики Беларуси. Так, первокурсники посвятили свои доклады проблемам обновления технологий производства и влиянию их на финансовую систему. Студенты по специальности "Экономика и управление производством", а это 3,4 и 5 курсы стационарного и заочного отделений, касались вопросов межличностных отношений в коллективах в условиях реструктуризации предприятий, совершенствования мотивационных систем, финансового состояния предприятий, управления конкурентоспособностью продукции, исследованию факторов повышения эффективности.

Особо следует отметить участие в конференции китайских студентов. Они рассказали о 20-летнем опыте страхования в Китае, который эффективно использует возможности рыночной экономики. В основу исследования положены публикации Юго-восточного института финансов на китайском языке по вопросам страхования имущества граждан и субъектов хозяйствования, а также свой опыт страхования своих рисков как иностранных граждан в Республике Беларусь.

Когда на трибуну вышла студентка группы ЭУ-33 Ван Сяонюй, зал приветствовал ее аплодисментами. Сидели тихо, так как всякий иностранец-студент хорошо говорит к пятому курсу, а здесь третий -- и достаточно хорошо. Предложение по докладу состояло в необходимости создания кружка для студентов из Китая, где можно было бы адаптировать данные китайского учебника к курсу "Организация страхования", который преподается на втором курсе. Китайских студентов удивляет то, что студенты нашего университета до сих пор не застрахованы,в то время как в нашей республике столько новых страховых организаций.

По итогам конференции принято решение: первое место с публикацией тезисов присудить студенту гр.ЭУ-51 А.Морозу за доклад на тему "Управление конкурентоспособностью продукции на предприятии" (научный руководитель доцент Г.Е.Кобринский).

Второе место с публикацией отдано студентке гр.ФК-11 Н.Зозуле за доклад "Роль современных технологий в повышении эффективности производства" (научный руководитель старший преподаватель А.Л.Войтишкина). Второе место получила также студентка гр. ЭУ-31 Л.Прокопенко за доклад "Оценка факторов, определяющих условия труда на производстве" (научный руководитель доцент Г.К.Болтрушевич).

Три третьи места присуждены студентке гр. ЭУ-31 О.Башлаковой за доклад "Применение бестарифных моделей оплаты труда" (научный руководитель доцент Г.К.Болтрушевич), студентке гр.ЭУ-33 Ван Сяонюй за доклад "Организация страхования в Китайской Народной Республике" (научный руководитель ассистент Э.И.Лизарева), студентке гр.ФК-11 Н.Платоновой за доклад "Современные технологии в условиях конверсии ВПК (на примере НПО "Ратон)" (научный руководитель старший преподаватель А.Л.Войтишкина).

**Э.ЛИЗАРЕВА,**
**ассистент кафедры коммерческой деятельности и финансов.**

**В.В.ПУГАЧОВА, дацэнт кафедры эканамічнай інфарматыкі і АСК:**

— Нашы студэнты выступілі з дакладамі, у якіх адлюстраваны праекты аўтаматызаванай апрацоўкі інфармацыі на ПЭВМ па рашэнню актуальных задач кіравання (планавання, уліку і аналізу) для прадпрыемстваў і арганізацый г.Гомеля і вобласці. Пры падвядзенні вынікаў работы секцыі ўлічваліся меркаванні групы экспертаў з ліку выкладчыкаў кафедры і студэнцкай аўдыторыі. З гэтай мэтай праводзілася анкетаванне ўдзельнікаў канферэнцыі і далейшая апрацоўка дадзеных апытання.

Для вызначэння ступені ўзгодненасці меркаванняў апрошваемых экспертаў упершыню ў гэтым годзе выкарыстоўвалася спецыяльная праграма, якая рэалізуе статыстычныя метады апрацоўкі экспертных ацэнак на ПЭВМ. Яе аўтар — студэнт гр. ЭІ-31 А.Швядзюк. З улікам навукова-абгрунтаванай ацэнкі (каэфіцыент узгодненасці меркаванняў экспертаў склаў 0,8) вынікі работы студэнцкай навуковай канферэнцыі ў секцыі "Эканамічная інфарматыка" выглядаюць наступным чынам: І месца заняў даклад студэнта гр.ЭІ-31 І.Каралёва, на другім — студэнты-дыпломнікі І.Шафарэнка і Т.Даймінская, трэцімі сталі студэнты-дыпломнікі В.Кавалеўскі і Н.Літвінчук.

Акрамя таго, студэнт І.Каралёў атрымаў запрашэнне выступіць з дакладам аб выніках сваіх навуковых даследаванняў на XXXIV навукова-тэхнічнай канферэнцыі аспірантаў і студэнтаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі.

Традыцыі

# СВЯТА КОЖНЫ ДЗЕНЬ

Шэрым і непрыкметным здавалася б нашае жыццё, калі б у ім не было святаў. Я маю на ўвазе не тыя афіцыйныя і запланаваныя, якія адбываюцца ў адзін і той жа дзень і праходзяць без аніякіх змен на працягу ўжо колькіх год. Я кажу пра святы, якія даруем сабе мы самі, пра тыя, якія робяць нашае жыццё цікавым і насычаным.

Вось, напрыклад, самы, здавалася б, звычайны тыдзень стаў своеасаблівым у жыцці філалагічнага факультэта. І прычына таму даволі ўрачыстая — студэнты праводзілі Дні свайго факультэта. За ўрачыстым адкрыццём, калі дзяўчаты праспявалі вядомы ўсім студэнтам "Gaudeamus", а дэкан філалагічнага факультэта У.Д.Еўтухоў прывітаў прысутных уступным словам, адбылася прэзентацыя зборніка "Крыніцы". Кнігу гэтую, куды ўвашлі вершы паэтаў, што так ці інакш звязаны з нашай alma mater, падрыхтаваў да выхаду ў свет загадчык кафедры беларускай літаратуры І.Ф.Штэйнер. Яму і належала ўступнае слова. Прафесар, які распрацоўвае пытанне аб так званай "гомельскай школе" у беларускай літаратуры, упэўніў усіх прысутных у тым, што прадстаўнікі яе сапраўды з'яўляюцца бачнымі асобамі ў літаратурным і культурным жыцці нашай краіны. Прычым не толькі тыя даваенныя паэты і аўтары ваенных часоў, без якіх зараз не абыходзіцца ні адна нацыянальная анталогія паэзіі, але і сучасныя маладыя мастакі слова, якія ўпэўнена заявілі пра сябе на працягу апошніх гадоў. І.Ф.Штэйнер таксама адзначыў і той факт, што не ўсе з тых, чые вершы знайшлі месца ў гэтай анталогіі, сталі прафесійнымі паэтамі, але "любоў да слова спрыяла пошукам самога сябе, дапамагала ім стаць сапраўднымі людзьмі".

На сустрэчу былі запрошаны і госці. Так, напрыклад, імпрэзу наведаў выпускнік ГДУ, які зараз працуе ў абласной газеце "Гомельская праўда" і, між іншым, працягвае пісаць вершы, — Сяргей Сыс. Ён прачытаў прысутным свае творы, якія надзвычай цёпла былі ўспрыняты публікай, а таксама распавёў пра гады сваёй вучобы ва універсітэце. Прычым, расказваў ён усё больш не пра сябе, а пра тых сваіх сакурснікаў, якія сталі зараз вядомымі дзеячамі літаратуры і культуры. Прыемна адзначыць і той факт, што сярод запрошаных у якасці гасцей былі і студэнты нашага універсітэта, вершы якіх таксама змешчаны на старонках зборніка "Крыніцы". А яны, дарэчы, не толькі паэты, але і барды. Вось і з'явілася выдатная магчымасць не толькі пачытаць іх вершы, але і пачуць у аўтарскім выкананні. Загучалі прыгожа-спеўныя галасы Наталлі Дзенісюк (ІІІ курс) і Зміцера Вінаградава (V курс), разнеслі па аўдыторыі водар цудоўна-веснавога настрою, напоўнілі сэрцы салодкім пачуццём.

Дзень за днём на працягу тыдня не спыняўся вясёлы шум на калідоры, у холе і на кафедры намесніка дэкана па выхаваўчай рабоце Л.П.Кузьміча. Тут размяшчаліся выставы. Адна з іх была прысвечана жыццю і дзейнасці Адама Міцкевіча (як вядома, 1998 г. — год А.Міцкевіча). Усім жадаючым прапаноўвалася для азнаямлення багатая і разнастайная спадчына беларуска-польскага пісьменніка і культурнага дзеяча. Праводзілася таксама і выстава пад назвай "Сваімі рукамі". У асноўным на ёй былі прадстаўлены малюнкі студэнтаў. Прычым працы даволі таленавітыя і цікавыя.

Асаблівай жа папулярнасцю, безумоўна, карысталіся насценныя газеты, створаныя рукамі першакурснікаў. Вось дзе спаўна выявіўся іх гумарыстычны аптымізм і погляды на жыццё. Каляровыя, яркія да стракатасці, цікавыя і несур'ёзныя — вось тыя эпітэты, якія найбольш падыходзяць да гэтых своеасаблівых студэнцкіх вынаходніцтваў.

Але найбольш цікавым і доўгачаканым было ток-шоу з выкладчыкамі. Амаль за месяц да яго насупраць дэканата была прымацавана чырвоная скрыня, куды ўсе жадаючыя маглі пакласці свае пытанні, якія адрасаваліся выкладчыкам. Такім чынам, арганізатары ток-шоу мелі цудоўную магчымасць даведацца, што ўсё ж хвалюе студэнтаў, што іх цікавіць, асабліва ў дачыненні да выкладчыкаў. Студэнтаў хвалявалі арганізацыйныя пытанні. Напрыклад, ці праўда тое, што без флюараграфіі не будуць дапускаць да заняткаў. Таксама студэнтаў цікавілі і пытанні больш асабістага кшталту: хто ў каго быў закаханы, ці прагульвалі лекцыі пад час навучання ў ВНУ, якія выпадкі з выкладчыцкай практыкі больш запомніліся.

Тыдзень сапраўды быў вельмі насычаны, вясёлы і цікавы. І ўсё ж ён скончыўся, і зноў пацягнуліся звычайныя вучэбныя будні. І так — да наступнага свята.

**Аксана ТУСІКАВА,**
**студэнтка гр. БА-34**
**філалагічнага факультэта.**

*Германія вачамі нашай студэнткі*

# ЛЁС ПАДАРЫЎ ШЧАСЛІВЫ ШАНС

(Заканчэнне. Пачатак у №8)

Вучоба ва універсітэце істотна адрозніваецца ад вучобы ў нашых вышэйшых навучальных установах. Яна патрабуе ад кожнага студэнта максімальнай самаадданасці і самастойнасці. У нямецкіх універсітэтах няма распарадку заняткаў -- кожны студэнт павінен складаць яго самастойна, паспеўшы запісацца на семінары яшчэ ў канцы папярэдняга семестра. Калі не паспеў або праспаў, можна перанесці гэты семінар на наступны семестр, так як ліміту на працягласць навучання ў Германіі няма, як, дарэчы, і няма платы за адукацыю, акрамя падаткаў. Патрэбныя і цікавыя лекцыі і семінары публікуюцца ў штосеместравым даведніку, які можна набыць за 20 марак у любым кіёску. Там няма ўступных іспытаў, абітурыенты прымаюцца па сярэдняму балу; і гэты сярэдні бал атэстата існуе толькі для студэнтаў-медыкаў, эканамістаў, правазнаўцаў. Адукацыя бясплатная, трэба толькі купляць неабходныя падручнікі, якія не вельмі танныя: адзін можа каштаваць да 50 марак, так як бібліятэка не забяспечвае студэнтаў належнымі падручнікамі. Дарэчы, ва універсітэцкай бібліятэцы можна па камп'ютэру знайсці патрэбную кнігу, але ж калі яе не існуе ў гэтай бібліятэцы, то можна аформіць заказ, і праз два-тры тыдні яна з'явіцца спецыяльна для пэўнага студэнта. Кожны студэнт не мае свайго фармуляра ў бібліятэцы, нумар студэнцкага білета занесены ў банк бібліятэчных дадзеных; пры дапамозе сканера інфармацыя трапляе ў камп'ютэр, які выдае колькасць кніг на пэўным нумары. Гэта вельмі эканоміць час.

Што кідаецца ў вочы -- ва універсітэце не знойдзеш ніводнай гардэробшчыцы, паўсюдна стаяць шафы і скрыні для вопраткі і партфеляў. Кожны студэнт павінен мець замок з ключом. Гэтая сістэма даўно ўжо адпрацавана і мае свае добрыя вынікі, бо скараціласся колькасць крадзяжоў асабістых рэчаў. Што асабліва цікава -- кожны прафесар, дацэнт мае свой кабінет з асабістым сакратаром і пэўныя гадзіны кансультацый кожны тыдзень. Да яго можна тады звярнуцца з пытаннем, просьбай або пажаданнем.

Усе лекцыйныя залы ў час лекцый запоўнены да немагчымасці студэнтамі, якія сядзяць нават на прыступках з-за нястачы месцаў. У час лекцыі некаторыя п'юць колу, іншыя -- гарбату, хтосьці каву, усё гэта можна купіць у трох кропках у аўтамаце.

А што гэта за студэнт, які не пакаштаваў стравы нямецкай кухні, не пабываў у сталоўцы! Там таксама картачная сістэма. Пры прад'яўленні студэнцкага білета за пяць марак, якія потым зноў вернуцца да гаспадара, можна набыць картку студэнцкай сталовай. У аўтамат патрэбна пакласці некаторую суму грошай, якая тут жа пераходзіць на картку, і такім чынам адбываецца безнаяўнаы разлік са сталовай. Кормяць няблага, пастаянна ёсць вялікі выбар, кожны гурман можа адшукаць што-небудзь для сябе. Амаль кожны тыдзень праводзіўся Тыдзень інтэрнацыянальнай кухні або кухні адной краіны. Студэнт мае магчымасць адведаць нешта экзатычнае, невядомае. Быў там і Тыдзень рускай кухні, калі гатавалі боршч, галубцы, беф-строганаў, дранікі і бліны. Трэба заўважыць, што для заходняга чалавека няма асаблівай розніцы, калі гавораць аб рэспубліках былога СССР. Таму ўсё для іх -- "Расія": Беларусь, Украіна і нават Узбекістан.

Мой інтэрнат знаходзіўся не вельмі далёка ад універсітэта, што было вельмі зручна, але да цэнтра горада, дзе я слухала лекцыі па нямецкай літаратуры і эканоміцы, трэба было дабірацца транспартам: аўтобусам і трамваем. Але гэта не вельмі танна: паездка ў адным толькі напрамку каштуе да 5 марак! Таму паўстала пытанне: купляць веласіпед або семестровую карту, што было амаль раўназначна. Я аддала перавагу праязному, так як у зімовыя месяцы, хоць там і цёпла, ідзе дождж. Не вельмі прыемна ўвесь час ездзіць на веласіпедзе, тым больш, што там надзвычай строгія законы і забараняецца ездзіць па тратуары, або ўдваіх -- адразу штраф. Ды і штрафы ў аўтобусах вельмі "шчодрыя" -- да 70 марак за раз.

Пажыўшы ў Германіі і ўбачыўшы ўнутраны склад гэтай краіны, я стала больш крытычна адносіцца да жыцця ў Германіі. Раней, калі я ездзіла на месяц або два, бачыла, у асноўным, толькі добрыя знешнія бакі. Зараз я разважаю зусім інакш. Калі не ведаеш саму сістэму і склад краіны, цяжка яе і зразумець...

Усё жыццё немцаў пабудавана на эканоміі і развазе. Нямецкія гаспадыні, збіраючыся ў супермаркет, спачатку запісваюць усё, што трэба купіць, каб не згубіцца ў такім мностве тавараў і не купіць лішняга. Дарэчы, у Германіі існуе сетка харчовых магазінаў з нізкімі цэнамі для бедных слаёў насельніцтва, куды па праву можна аднесці і студэнта, бо ён, толькі ён самастойна павінен шукаць сродкі для існавання, і неблагія сродкі, каб выжыць.

У Германіі здаўна існуе спецыяльная арганізацыя па дапамозе ў пошуках спадарожнікаў у легкавых аўтамабілях. Туды можа абсалютна бясплатна звярнуцца кожны вадзіцель і прапанаваць свае паслугі, пакінуўшы каардынаты. Гэтая арганізацыя ўжо шукае яму спадарожнікаў, якія таксама звяртаюцца туды, але ж, за асабовы тарыф: 18 марак за паслугі і да 25 марак, незалежна ад кірунку, вадзіцелю. Гэта ўсё роўна больш танна, чым цягнік, за які трэба аддаць да 100 марак за адлегласць, напрыклад, у 300 км.

З новага года ў Германіі з'явілася вялікая колькасць тэлефонных фірм-канкурэнтаў -- раней існаваў толькі Тэлеком. Пры ўстаноўцы тэлефона трэба плаціць немалыя грошы, але гэта робіцца ўсяго за адзін тыдзень: сёння падаў заяву і праз тыдзень тэлефануй! Пры адключэнні тэлефона таксама патрэбна плаціць. Але ўсё гэта здымаецца штомесячна з рахунку ў банку -- эканомія часу і нерваў.

Я зразумела, што ў Германіі кожны крок каштуе грошай, і немалых.

Каб нам прывыкнуць да такога складу жыцця, патрэбны гады, гады, гады... І ўсё роўна застаецца невядомым, ці можна ўвогуле нам прывыкнуць -- нам, якія заўсёды дзеляцца і аддаюць апошняе.

**Вольга МЕЛЬНІКАВА,**
**студэнтка гр.Н-44**
**філалагічнага факультэта.**

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА І КУРС ДЗЁННАГА АДДЗЯЛЕННЯ НА 1998-1999 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Ва універсітэт прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю і пастаянна пражываюць у рэспубліцы, грамадзяне Беларусі і беларусы, якія пражываюць за яе межамі, а таксама грамадзяне Расійскай Федэрацыі. Указаныя грамадзяне маюць права атрымаць на конкурснай аснове бясплатную вышэйшую адукацыю ва універсітэце, калі адукацыя дадзенага ўзроўню атрымліваецца ўпершыню. Грамадзяне іншых краін здаюць уступныя экзамены, удзельнічаюць у конкурсе і прымаюцца на аснове дагавораў з аплатай навучання.

Універсітэт ажыццяўляе прыём студэнтаў звыш плана прыёму на ўмовах дагавораў з аплатай юрыдычнымі або фізічнымі асобамі. На месцы звыш плана прыёму, колькасць якіх устанаўліваецца прыёмнай камісіяй, залічваюцца абітурыенты, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсу ва універсітэт або іншую ВНУ пры ўмове здачы адпаведных экзаменаў, незалежна ад іх формы, а таксама па выніках субяседавання па прадметах уступных экзаменаў і па сярэдняму балу адзнак дакументаў аб сярэдняй адукацыі. Субяседаванне праводзіцца **з 25 па 28 жніўня**.

Прыём заяў — **з 26 чэрвеня па 15 ліпеня**. Уступныя экзамены — **з 16 па 31 ліпеня**. Залічэнне ў студэнты: па плану — **да 5 жніўня**, на ўмовах аплаты — **да 1 верасня**.

Паступаючыя ва універсітэт падаюць у прыёмную камісію наступныя дакументы:
— заяву на імя рэктара;
— дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале;
— 6 чорна-белых фотакартак памерам 3х4 см;
— медыцынскую даведку па форме 086/У;
— дакументы, якія пацвярджаюць права карыстання льготамі;
— пашпарт (прад'яўляецца ў прыёмную камісію абітурыентам асабіста).

Усе ўступныя экзамены з'яўляюцца конкурснымі. Яны (акрамя экзамена па спецфізпадрыхтоўцы) праводзяцца па праграмах, складзеных у адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі і зацверджанымі Міністэрствам адукацыі.

Абітурыенты, якія не з'явіліся на экзамен без уважлівых прычын або атрымалі нездавальняючую адзнаку, да далейшых экзаменаў не допускаюцца.

Абітурыенты здаюць наступныя уступныя экзамены: (гл.табліцу).

| NN | Спецыяльнасць | Экзамены |
|---|---|---|
| 1. | Руская мова і літаратура | 1. Руская мова (дыктоўка).<br>2. Руская мова і літаратура (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура (сачыненне). |
| 2. | Руская мова і літаратура са спецыялізацыяй "Беларуская мова і літаратура" | 1. Руская мова (дыктоўка).<br>2. Руская мова і літаратура (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура (сачыненне). |
| 3. | Беларуская мова і літаратура | 1. Беларуская мова (дыктоўка).<br>2. Беларуская мова і літаратура (вусна).<br>3. Руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 4. | Беларуская мова і літаратура са спецыялізацыяй "Англійская мова" | 1. Беларуская мова (дыктоўка).<br>2. Англійская мова (вусна, з аўдзіраваннем і лексіка-граматычным тэстам).<br>3. Беларуская мова і літаратура (вусна). |
| 5. | Англійская мова | 1. Англійская мова (пісьмова).<br>2. Англійская мова (вусна).<br>3. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>4. Беларуская мова або руская мова (дыктоўка). |
| 6. | Нямецкая мова | 1. Нямецкая мова (пісьмова).<br>2. Нямецкая мова (вусна).<br>3. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>4. Беларуская мова або руская мова (дыктоўка). |
| 7. | Матэматыка | 1.Матэматыка(вусна).<br>2. Матэматыка (пісьмова).<br>3. Беларуская мова і літаратура, або руская мова і літаратура (излажэнне). |
| 8. | Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт | -//- |
| 9. | Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве | -//- |
| 10. | Камерцыйная дзейнасць | -//- |
| 11. | Фінансы і крэдыт | -//- |
| 12. | Прыкладная матэматыка | -//- |
| 13. | Фізіка (вытворчае і педагагічнае аддзяленні) | 1. Фізіка (вусна).<br>2. Матэматыка (пісьмова).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (излажэнне). |
| 14. | Фізіка з дадатковай спецыяльнасцю "Тэхнічная творчасць" | -//- |
| 15. | Фізічная электроніка | -//- |
| 16. | Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі | -//- |
| 17. | Геалогія і разведка карысных выкапняў | -//- |
| 18. | Гісторыя | 1. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>2. Замежная мова (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 19. | Гісторыя з дадатковай спецыяльнасцю "Англійская мова" | 1. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>2. Англійская мова (вусна, з аўдзіраваннем і лексіка-граматычным тэстам).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 20. | Правазнаўства | 1. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>2. Сусветная гісторыя (вусна).<br>3. Замежная мова (вусна).<br>4. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 21. | Геаграфія | 1. Геаграфія (вусна).<br>2. Замежная мова (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 22. | Экалогія | 1. Геаграфія (вусна).<br>2. Біялогія (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 23. | Псіхалогія | 1. Біялогія (вусна).<br>2. Матэматыка (пісьмова).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 24. | Біялогія | 1. Біялогія (вусна).<br>2. Хімія (пісьмова).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 25. | Фізічная культура і спорт (агульнапедагагічнае і спартыўна-педагагічнае аддзяленні) | 1. Экзамен па спецфізпадрыхтоўцы.<br>2. Біялогія (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (излажэнне). |

Апеляцыі па пытаннях экзаменацыйных адзнак падаюцца адказнаму сакратару прыёмнай камісіі на імя рэктара ў дзень правядзення вуснага экзамена або ў дзень аб'яўлення адзнакі па пісьмоваму экзамену. Паўторная здача экзамена не дазваляецца.

Без уступных экзаменаў залічваюцца:

— пераможцы (I,II,III месцы) міжнародных, а таксама рэспубліканскіх алімпіяд выпускнікоў сярэдніх навучальных устаноў і педвучылішчаў, праведзеных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1997/98 навучальным годзе па агульнаадукацыйных прадметах, пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці;

— пераможцы (I,II,III месцы) Гомельскіх абласных алімпіяд выпускнікоў школ, праведзеных па агульнаадукацыйных прадметах, пры паступленні на адпаведныя спецыяльнасці;

— пераможцы (I,II,III месцы) Гомельскай гарадской алімпіяды па інфарматыцы пры паступленні на спецыяльнасць "Прыкладная матэматыка";

— пераможцы (дыплом I ступені) універсітэцкай алімпіяды па фізіцы пры паступленні на фізічны факультэт;

— пераможцы (дыплом I ступені) універсітэцкай алімпіяды па матэматыцы пры паступленні на спецыяльнасць "Матэматыка".

Асобы, якія закончылі школу з медалём, сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову або ПТВ (на аснове базавай школы) з дыпломам з адзнакай: пры паступленні на спецыяльнасці "Матэматыка", "Фізіка", "Фізіка і тэхнічная творчасць", "Геалогія і разведка карысных выкапняў" залічваюцца па выніках субяседавання па дысцыпліне, якая ўказана ў пераліку ўступных экзаменаў першай; пры паступленні на іншыя спецыяльнасці здаюць усе ўступныя экзамены.

Правамі медалістаў карыстаюцца пераможцы (дыплом II ступені) універсітэцкіх алімпіяд па фізіцы і матэматыцы, а таксама ўдзельнікі Гомельскіх абласных алімпіяд па фізіцы і матэматыцы, занятых 4-10 месцы, пры паступленні на спецыяльнасці "Матэматыка", "Фізіка", "Фізіка і тэхнічная творчасць".

Субяседаванне праводзіцца 13 ліпеня. Асобы, не залічаныя па выніках субяседавання, здаюць усе ўступныя экзамены.

Слухачы факультэта падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ і прафарыентацыі залічваюцца ў адпаведнасці з палажэннем аб ім.

Універсітэт ажыццяўляе мэтавы і мэтавы кантрактны прыём. Залічэнне абітурыентаў на ўмовах мэтавай кантрактнай падрыхтоўкі спецыялістаў ажыццяўляецца згодна даведзеных планаў мэтавага прыёму і адпаведных палажэнняў.

Залічэнне ва універсітэт праводзіцца па конкурсу ў адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных абітурыентамі на ўступных конкурсных экзаменах. Конкурс праводзіцца па спецыяльнасцях.

Пры залічэнні на спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве", "Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт", "Камерцыйная дзейнасць", "Фінансы і крэдыт" праводзіцца раздзельны конкурс сярод выпускнікоў гарадскіх і сельскіх школ прапарцыянальна пададзеных заяў.

Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах залічваюцца:

— воіны-інтэрнацыяналісты;

— круглыя сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў;

— дзеці з сем'яў загінуўшых (памёршых) або стаўшых інвалідамі ў час праходжання воінскай службы або работы ў складзе савецкіх войск на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, загінуўшых (памёршых) у мірны час пры праходжанні воінскай службы;

— інваліды I і II груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў ВНУ і якія могуць наведваць заняткі;

— асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт.18 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай

(Заканчэнне на 4-й стар.)

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА І КУРС ДЗЁННАГА АДДЗЯЛЕННЯ НА 1998-1999 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

**(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)**

абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС";

— суайчыннікі з іншых краін па рэкамендацыях беларускіх арганізацый і навучальных устаноў замежжа на спецыяльна выдзеленыя месцы.

Пры роўнасці конкурсных балаў перавагу маюць:

— медалісты школ, выдатнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ПТВ на аснове базавай школы, а таксама выдатнікі ПТВ на аснове сярэдняй школы пры паступленні на спецыяльнасці, адпавядаючыя атрыманым прафесіям;

— інваліды III групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў;

— асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт.19,20,23,24,25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС";

— прафесійна арыентаваныя абітурыенты (закончылі факультэт падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ і прафарыентацыі, маюць стаж работы па спецыяльнасці, адпавядаючай абранай, або іншую прафесійную арыентацыю);

— звольненыя ў запас ваеннаслужачыя, якія маюць ільготы, устаноўленыя заканадаўствам, і рэкамендацыі воінскіх часцей;

— асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух гадоў;

— абітурыенты, у якіх бацька або маці інваліды, або абітурыенты з мнагадзетных сем'яў.

Для атрымання другой вышэйшай адукацыі прымаюцца асобы на ўмовах поўнай аплаты навучання. Парадак залічэння гэтых асоб вызначаецца адпаведным палажэннем.

Усе іншыя пытанні, звязаныя з прыёмам, канчаткова вырашаюцца прыёмнай камісіяй універсітэта на аснове заканадаўства Рэспублікі Беларусь і "Парадку прыёму ў дзяржаўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь на 1998 год".

Дакументы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул. Савецкая, 104, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны, прыёмная камісія. Тэлефоны: 57-69-17 (адказны сакратар), 56-73-38 (прыёмная камісія).

**ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ.**

## ЭКЗАМЕНЫ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ФІЗІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ

Зыходным палажэннем экзаменаў па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы з'яўляецца вызначэнне ўзроўню агульнафізічнай падрыхтаванасці і рухальнага апарату абітурыентаў.

Здача экзаменаў пачынаецца з дыферэнцыраванага заліку па плаванню і пры паспяховай яго здачы абітурыенты працягваюць здаваць экзамен па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы. Ён уключае нарматывы і патрабаванні спартыўнага шматбор'я, у якім прадугледжана выкананне чатырох абавязковых відаў фізічных практыкаванняў у адпаведнасці з існуючымі правіламі спаборніцтваў.

Вынік кожнага віду фізічных практыкаванняў ацэньваецца ў заліковых балах /гл.табліцу/. У табліцы таксама паказаны нарматывы і патрабаванні да заліку па плаванню. Дыстанцыю можна праплыць адным з існуючых стыляў плавання, прадугледжаных спартыўнай класіфікацыяй.

Неабходна адзначыць, што выкананне любога спартыўнага нарматыву чатырохбор'я ніжэй заліковага ацэньваецца двума /"2"/ баламі, якія не з'яўляюцца заліковымі і не ўваходзяць у агульную суму бальнай адзнакі за экзамен.

Такім чынам, адзнака па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы складаецца з сумы вынікаў толькі заліковых балаў, набраных абітурыентам у спартыўным шматбор'і:

ад 18 да 20 балаў -- 5 /выдатна/;
ад 14 да 17 балаў -- 4 /добра/;
ад 10 да 13 балаў -- 3 /здавальняюча/.

Адзнака дыферэнцыраванага заліку па плаванню будзе ўлічвацца ў конкурснай сітуацыі пры залічэнні ў студэнты.

| Экзамены | Узрост | Нарматыўныя патрабаванні і заліковыя балы | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | мужчыны | | | жанчыны | | |
| СПЕЦФІЗПАДРЫХТОЎКА | | 5 | 4 | 3 | 5 | 4 | 3 |
| Лёгкая атлетыка: | | | | | | | |
| Бег 100м /сек/ | 17-29 | 12.6 | 13.1 | 13.6 | 14.5 | 15.5 | 16.5 |
| | 30 і болей | 13.0 | 13.5 | 14.0 | 15.0 | 16.0 | 17.0 |
| Бег 1000м /мін, сек/ | 17-29 | 3.05 | 3.10 | 3.20 | 3.52 | 4.10 | 4.30 |
| | 30 і болей | 3.15 | 3.25 | 3.35 | 4.10 | 4.30 | 5.00 |
| Кіданне гранаты /м/ | 17-29 | 48.0 | 44.0 | 38.0 | 32.0 | 27.0 | 22.0 |
| | 30 і болей | 45.0 | 41.0 | 35.0 | 27.0 | 22.0 | 18.0 |
| Падцягванне ў вісе на перакладзіне хватам зверху | 17-29 | 15 | 12 | 8 | - | - | - |
| | 30 і болей | 12 | 9 | 6 | - | - | - |
| Згібанне і разгібанне рук ва ўпоры лежачы /згібанне рук не менш 90⁰, колькасць разоў/ | 17-29 | - | - | - | 28 | 22 | 14 |
| | 30 і болей | - | - | - | 22 | 18 | 11 |
| Плаванне 100м /мін, сек/ вольны стыль | 17-29 | 1.32 | 1.47 | 2.02 | 1.38 | 1.53 | 2.08 |
| | 30 і болей | 1.42 | 1.57 | 2.12 | 1.48 | 2.03 | 2.18 |
| брас | 17-29 | 1.45 | 2.00 | 2.15 | 2.03 | 2.18 | 2.33 |
| | 30 і болей | 1.55 | 2.10 | 2.25 | 2.13 | 2.28 | 2.43 |
| кроль на спіне | 17-29 | 1.45 | 2.00 | 2.15 | 1.53 | 2.08 | 2.23 |
| | 30 і болей | 1.55 | 2.10 | 2.25 | 2.03 | 2.18 | 2.33 |



## СИМВОЛ ВЕРЫ

Н.В.Родченко — не новое имя в литературе. Его перу принадлежит целый ряд рассказов, художественно-публицистических статей, эссе, помимо многочисленных научных трудов по литературоведению и поэтике. Наш земляк, сын белорусского партизана, доцент кафедры русской литературы Николай Викторович Родченко начал заниматься творчеством давно. Книга "Символ веры", вышедшая из печати в конце 1997 года, — результат литературной работы автора за последние пятнадцать лет. Прежде все свои произведения Н.Родченко издавал в городской, внутривузовской периодике, имеющей незначительную читательскую аудиторию, несколько раз публиковался в журнале "Неман".

Война и Чернобыль — основные темы повествований Николая Родченко. Пишет он и о природе, послевоенной жизни белорусского Полесья, современном быте города и деревни. Автор сам раскрывает основной пафос своих произведений как "любовь к этим людям, к родной земле, страстное желание запечатлеть близких мне полещуков литературными средствами, а это значит прежде всего в их живом языковом обличье". В мастерстве писателя, художественной силе его произведений можно убедиться, наткнувшись случайно на такие строки из раннего рассказа "Куцаха" ("Неман",N3,1982):

"До дому оставалось километра полтора-два. Садилось солнце, лес по левую руку становился задумчивым и таинственным, из придорожной травки на гравий выпрыгнула брюхатая жаба — вестница наступающей прохлады и недалеких сумерек. Куцаха задавала коням бодрый темп хода, отец с гордостью за сыновей говорил об успешной поездке, о том, что по холодку с помощью соседей мы быстро разгрузимся, что мать обязательно приготовила лесорубам хороший ужин и что на всякий случай перед въездом в деревню надо допить остатки водки — мы это заслужили.

Ночь спешила взять свое, сумерки сгущались..."

Рассказчик очень точно, в подробностях, обрисовывает быт деревни, можно сказать, по-толстовски, раскрывает психологию не только односельчан, но и главной героини повествования, неизвестно откуда оказавшейся в деревне иноземной кобылы Куцахи.

В авторском языковом психологизме кроется разгадка притягательности рассказов "Куцаха", "Полесские детективы", отрывка из повести "Шабашка" (глава "Вера"), десятистрочной зарисовки "Свои мысли", партизанского цикла рассказов, в частности, "Во имя отца и сына", "Господи-сусе", "Символ веры" — они незабываемы и не позволяют читателю оставаться равнодушным к изображаемому.

xxx

**Чернобыль и война.**

Двадцать шестое апреля и 9 Мая — две разные, но странным образом связанные между собой годовщины, и не только близостью в календаре. Две даты — напоминания.

В двадцатом веке человечество стало обладать сложными и потенциально опасными технологиями с глобальным влиянием на всю планету. Одним из примеров этому является ядерная энергия. Последствия аварии на Чернобыльской АЭС в 1986 году — это напоминание о возможном возвращении к мировому хаосу.

Вероятно, самый главный урок Чернобыля в том, — пишет известный американский ученый Р.Гейл, — что он предупредил нас о потенциальных опасностях ядерной войны. По сравнению даже с бомбой в одну мегатонну, взорванной намеренно или случайно, авария в Чернобыле покажется незначительной.

Острую, актуальную для жителей Гомельщины и всей республики тему Чернобыля затрагивает Н.В.Родченко в психологической чернобыльской драме "Звезда Апсиндос", осветившей события на берегу Припяти утром того дня, который разделил нашу жизнь на "до" и "после Чернобыля", в небольших рассказах "Педагогические экзерсисы", "Жахи", в жутком, скорее напоминающем ожившие мистерии, описании с натуры "Сон", даже в увлекательной детективной истории "Европейский уровень", перипетии сюжета которой приводят к разговору о серьезном: о Чернобыле — "трагедии вселенской, белорусской, гомельской".

Разные по жанру и объему, психологической или фактологической направленности, эти произведения нацелены на выявление в людях высшего начала, напоминают о том, что война не кончилась...

Автор в совершенстве владеет приемами языкового и художественного мастерства, средствами создания психологизма, обладает огромным опытом. Книга "Символ веры" не только интересная, но и нужная, по ней можно учить и воспитывать новые поколения, как сказано в авторском предисловии, "по нашему собственному, вековому, национальному, белорусскому разумению". Появление этой книги надо признать событием примечательным.

Книга вышла в независимом издательстве МП "Белорит" при участии "ФУА".

**А.ВЛАСОВ,**
**кандидат филологических наук, доцент кафедры психологии и довузовской подготовки.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства — дацэнта;
— французскай мовы — выкладчыка;
— матэматычных праблем кіравання — дацэнта;
— тэарэтычнай фізікі — асістэнта;
— геаграфіі — асістэнта (3);
— фізвыхавання і спорту — ст.выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

**Спорт**

## СТУДЭНТЫ ГДУ — ЛЕПШЫЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ

У Мінску прайшло першынство Беларусі па паўэрліфтынгу ў праграме студэнцкай спартакіяды, у якім прынялі ўдзел каманды 17 ВНУ.

Ізноў, як і ў мінулым годзе, студэнты нашага універсітэта заваявалі Кубак — 118 ачкоў. 35 ачкоў уступіла каманда Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута і на трэцім месцы — Беларуская політэхнічная акадэмія — 78 ачкоў.

Студэнты факультэта фізічнай культуры майстар спорту міжнароднага класа, сярэбраны прызёр чэмпіянату Еўропы Уладзімір Гадуноў (67,5 кг), майстры спорту Сяргей Гуцаў (90 кг) і Дзмітрый Глухотка (110 кг) падняліся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару.

Другакурснік гісторыка-юрыдычнага факультэта Раман Валетаў (52 кг) і першакурснік факультэта фізічнай культуры Аляксандр Конан (60 кг) прывезлі сярэбраныя медалі першынства.

Да гэтага трэба дадаць, што трэніруе нашых волатаў майстар спорту Уладзімір Галавач — нам. дэкана па выхаваўчай і спартыўна-масавай рабоце матэматычнага факультэта.

## НА ПАМОСЦЕ — ВЕТЭРАНЫ

У г.п.Мікашэвічы (Брэсцкая вобл.) праведзены чэмпіянат Беларусі па цяжкай атлетыцы сярод ветэранаў.

Добра выступілі нашы ветэраны. Абсалютным чэмпіёнам рэспублікі стаў дацэнт кафедры філасофіі майстар спорту СССР Аляксей Фяськоў. Сярэбраны медаль заваяваў майстар спорту Уладзімір Галавач — ст.выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.

**В.МАРЧАНКА.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар
Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 189.
Падпісана да друку 5.05.98.